# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 32 (156) 8 СТУДЗЕНЯ 1991 ГОДА


## *ІМЯННАЯ СТЫПЕНДЫЯ*

**На падставе пастановы Савета Міністраў Беларускай ССР ад 12.11.90 № 281 Вучоны савет універсітэта прыняў рашэнне аб назначэнні імянной стыпендыі імя Я. Ф. Карскага студэнтцы III курса чацвёртай групы філалагічнага факультэта Наталлі Тадэушаўне ЧАРНЯЎСКАЙ.**

## *АДБЫЛОСЯ*

**чарговае пасяджэнне Вучонага савета Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта ім. Я. Купалы. Былі разгледжаны наступныя пытанні:**

**1. Аб пераводзе вылічальнага цэнтру на новыя ўмовы гаспадарання і фінансавання.**

**2. Аб ходзе выканання калектывам універсітэта доўгачасовай праграмы «Родная мова і культура».**

**3. Абмеркаванне праекта Закону народнай адукацыі БССР.**

**4. Зацвярджэнне тэм дысертацыйных прац аспірантаў.**

**Па першаму пытанню заслухалі начальніка вылічальнага цэнтру К. П. Ягоўдзіка. У абмеркаванні прынялі ўдзел А. В. Бадакоў, Ю. Э. Белых, Ю. М. Рычкоў, А. А. Крыніцкі.**

**Аб ходзе выканання праграмы «Родная мова і культура» расказаў выконваючы абавязкі загадчыка кафедры беларускай літаратуры П. І. Маляўка. Свае меркаванні выказалі А. В. Бадакоў, І. П. Крэнь, І. В. Жук, І. А. Болдак.**

**Загадчык вучэбнага аддзелу Ю. Э. Белых пазнаёміў членаў Савета з праектам Закону аб народнай адукацыі БССР.**

**Прарэктар па навуковай рабоце А. І. Васкабоеў абвясціў тэмы дысертацыйных прац аспірантаў, якія і былі зацверджаны.**

**Былі разгледжаны іншыя пытанні. Так, члены Вучонага савета заслухалі і зацвердзілі справаздачу старшага навуковага супрацоўніка А. В. Карлюкова за першы год работы над доктарскай дысертацыяй.**

**Вырашана перавесці дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права У. А. Томсінава на пасаду старшага навуковага супрацоўніка для падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі.**

**Члены Вучонага савета заслухалі інфармацыю загадчыка вучэбнага аддзелу Ю. Э. Белых аб інструктыўных дакументах, пазнаёміліся са Зваротам ЦК ВЛКСМ да рэктараў, саветаў ВНУ, пастановай «Аб парадку вывазу (адпраўкі) тавараў і іншых матэрыяльных каштоўнасцей за межы БССР», з парадкам накіравання савецкіх спецыялістаў у замежныя фірмы для практычнай стажыроўкі, з палажэннем аб расследаванні і ўліку няшчасных выпадкаў з вучнёўскай моладдзю і выхаванцамі ў сістэме Дзяржадукацыі СССР, а таксама з парадкам праходжання стажыроўкі кіруючых кадраў, зноў абраных або назначаных на пасаду.**

**Ю. Э. Белых пазнаёміў прысутных з парадкам заключэння індывідуальных дагавораў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй.**

## *УВАГА!*

**У прафкоме студэнтаў нашага універсітэта ёсць наступныя пуцёўкі:**

**Дом творчасці ў Камарова пад Ленінградам. З 24 студзеня па 16 лютага гэтага года. Кошт 120 рублёў.**

**Дзве пуцёўкі ў дом творчасці ў Рузе. З 18 студзеня па 10 лютага. Кошт 140 рублёў.**

**Студэнты плацяць толькі**

АФІЦЫЙНЫ РАЗДЗЕЛ

## *«АБ ДАДАТКОВЫХ МЕРАХ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ СЕМ´ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ...»*

На аснове пастановы Савета Міністраў СССР ад 2 жніўня 1990 года № 759 **«Аб дадатковых мерах па сацыяльнай абароне сем´яў з дзецьмі ў сувязі з пераходам да рэгулюемай рыначнай эканомікі»** з 1 снежня 1990 г. устанаўліваецца аднаразовая дапамога пры нараджэнні дзіцяці ў трохкратным размеры мінімальнай заработнай платы, а таксама штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце ад 1,5 да 6 гадоў у размеры 50 працэнтаў мінімальнай заработнай платы на кожнае дзіця, якое знаходзіцца на ўтрыманні сям´і, калі сярэдні сукупны даход на члена сям´і не перавышае двухкратнай велічыні мінімальнай заработнай платы.

Аднаразовая дапамога пры нараджэнні дзіцяці выплачваецца на дзяцей, якія нарадзіліся 1 снежня 1990 г. і пазней, незалежна ад чарговасці нараджэння дзіцяці, выплата робіцца па месцу работы, вучобы маці, а калі маці не працуе і не вучыцца — то па месцу работы, вучобы бацькі за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання.

Штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце ад 1,5 да 6 гадоў выплачваецца па месцу работы, вучобы маці, а калі маці не працуе, не вучыцца — па месцу работы, вучобы бацькі. Гэта дапамога ў снежні 1990 г. выдаецца за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання, а са студзеня 1991 года за кошт сродкаў пенсіённага фонду.

БУДУЧЫНЯ УНІВЕРСІТЭТА

## І ПРЫЙДЗЕ ДОЎГАЧАКАНАЕ НАВАСЕЛЛЕ...

У 13 пяцігодцы ў нашым горадзе плануецца пачаць будаўніцтва студэнцкага гарадка. Нядаўна ў рэктара адбылася нарада па разгляду стадыі «Тэхніка-эканамічны разлік». Галоўны архітэктар праекта Ігар Канстанцінавіч Трыкоз з Днепрапятроўскага філіялу інстытута «Гипроуз» прадставіў свой варыянт галоўнага вучэбна-лабараторнага корпуса Гродзенскага універсітэта. На ведамаснай нарадзе вырашылі ў асноўным адобрыць прапанаваны варыянт з некаторымі пажаданнямі. Так, прапанавана павялічыць плошчу бібліятэкі, унесці некаторыя змены ў фасад корпуса. Агульная плошча вучэбных памяшканняў у галоўным корпусе складзе 103 тысячы квадратных метраў.

Універсітэцкі гарадок размесціцца паміж вуліцамі Болдзіна, Каліноўскага і праспектам Будаўнікоў. Прадугледжана комплексная забудова, якая ахопіць і вучэбную і сацыяльную сферы. Работы будуць весціся ў тры этапы. Першы этап уключае ў сябе будаўніцтва галоўнага вучэбна-лабараторнага корпуса (13 пяцігодка), бібліятэкі (пачатак у 1994 годзе), сталовай на 250 пасадачных месц (1993-1994 г.г.), сямейнага інтэрната на 107 кватэр (1992-1993). І інтэрнат на 740 месц (13 пяцігодка).

Другі этап, што расцягнецца на 14 пяцігодку, прадугледжвае будаўніцтва спартыўнага комплекса, другога вучэбна-лабараторнага корпуса, кафэ, інтэрната, сталовай, актавай залы, школы-інтэрната. Што датычыцца трэцяга этапа, то ў 15 пяцігодцы плануецца пабудаваць трэці лабараторны корпус і да 2005 года — інтэрнат. Агульны кошт будаўніцтва ўсяго комплекса па сённяшніх расцэнках — 79,5 мільёна рублёў.

**НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд студэнцкага гарадка.**

**І. АНІКЕВІЧ.**



## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ

# СТАТУТ

## ФОНДУ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕНАСЦІ СТУДЭНТАЎ І МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПРЫ ГРОДЗЕНСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ім. Я. КУПАЛЫ

**АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Фонд сацыяльнай абароненасці студэнтаў і маладых спецыялістаў пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ім. Я. Купалы (ФСАСіМС) — самакіруемы орган студэнтаў і маладых спецыялістаў універсітэта, які ажыццяўляе сваю дзейнасць згодна з Канстытуцыяй БССР, заканадаўствам БССР, а таксама даным Статутам.

ФСАСіМС прызваны мабілізаваць шырокую грамадскасць Беларускай рэспублікі на ўдзел у аказанні сацыяльнай дапамогі студэнтам і маладым спецыялістам, якія скончылі ГрДзУ ім. Я. Купалы, і прымае ўсе неабходныя меры для забеспячэння прававой і іншай абароны данай катэгорыі моладзі ад усіх форм дыскрымінацыі з боку дзяржаўных устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў і грамадзян.

2. Заснавальнікамі ФСАСіМС з 'яўляюцца Гродзенскі дзяржаўны універсітэт ім. Я. Купалы, прафком студэнтаў, прафком выкладчыкаў і супрацоўнікаў, камітэт камсамола, партком КПБ і рэктарат універсітэта.

3. У дзейнасці ФСАСіМС на добраахвотных асновах могуць прымаць удзел грамадзяне, установы і арганізацыі Беларускай рэспублікі, а таксама грамадзяне і арганізацыі іншых дзяржаў.

4. ФСАСіМС у сваёй дзейнасці кіруюцца агульначалавечымі прынцыпамі гуманізму, узаемадапамогі, дэмакратыі і шырокай галоснасці, на аснове ініцыятывы і самадзейнасці шырокага грамадскага актыву.

5. ФСАСіМС будуе сваю работу ў цесным узаемадзеянні з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам ім. Я. Купалы, а таксама яго грамадскімі арганізацыямі.

**ЗАДАЧЫ І АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ**

**6. Фонд сацыяльнай абароненасці студэнтаў і маладых спецыялістаў:**

— прыцягвае ўвагу грамадскасці і працоўных калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў Беларусі да праблем студэнтаў і маладых спецыялістаў; уносіць па гэтых пытаннях прапановы ў дзяржаўныя і іншыя органы; садзейнічае забеспячэнню практычнай дапамогі моладзі данай катэгорыі;

— збірае і размяркоўвае матэрыяльныя і іншыя сродкі на аказанне сацыяльнай і іншай дапамогі малазабяспечаным студэнтам, у першую чаргу, студэнтам-сіротам, якія маюць дзяцей, а таксама студэнтам-інвалідам 1 і 2 групы; аказвае матэрыяльную і іншую дапамогу пасля заканчэння вучобы;

— праводзіць у дабрачынных мэтах аукцыёны, канцэрты і іншыя мерапрыемствы; можа ствараць ва ўстаноўленым парадку прадпрыемствы, установы, кааператывы і іншыя арганізацыі, якія выконваюць задачы, вызначаныя мэтамі фонду;

— прапагандуе мэты фонду і інфармуе грамадскасць Беларускай рэспублікі аб яго рабоце, выкарыстоўваючы для гэтага сродкі масавай інфармацыі рэспублікі, друкаваныя выданні заснавальнікаў, а таксама асабістыя выданні;

— здзяйсняе другую дзейнасць, якая не супярэчыць напрамкам, вызначаным Статутам.

**СРОДКІ ФОНДУ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕНАСЦІ СТУДЭНТАЎ І МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ**

**7. Крыніцамі ўтварэння сродкаў ФСАСіМС з 'яляюцца:**

— добраахвотныя грашовыя ўзносы і адлічэнні працоўных калектываў дзяржаўных, грамадскіх і іншых арганізацый, грамадзян, а таксама замежных юрыдычных і фізічных асоб;

— даходы ад мерапрыемстваў, якія праводзяцца на карысць фонду, спецыяльных латарэй, вытворчай, выдавецкай і іншай дзейнасці;

— дарэнне і завяшчанне маёмасці і грашовых сродкаў;

— адлічэнне сродкаў ад калектыўных добраахвотных прац;

— іншыя паступленні.

8. Грашовыя ўзносы прымаюцца банкаўскімі ўстановамі наяўнымі, паштовымі і тэлеграфнымі пераводамі або пералічэннем іх на спецыяльны рахунак ФСАСіМС.

9. Грашовыя сродкі ФСАСіМС расходуюцца згодна з яго мэтамі і задачамі пад кантролем праўлення фонду.

**КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ ФСАСіМС ГрДзУ ім. Я. КУПАЛЫ**

10. Вышэйшым кіруючым органам ФСАСіМС з 'яўляецца агульны сход членаў фонду, склікаемы па меры неабходнасці, але **не радзей аднаго разу ў год.**

11. **Агульны сход ФСАСіМС:**

— слухае і зацвярджае справаздачы праўлення і рэвізійнай камісіі фонду;

— уносіць змены і дапаўненні ў Статут фонду;

— разглядае і зацвярджае доўгатэрміновыя праграмы і планы дзейнасці фонду;

— выбірае праўленне і рэвізійную камісію фонду;

— вырашае іншыя важныя пытанні, звязаныя з дзейнасцю фонду.

12. Усе рашэнні, у тым ліку і па пытаннях кіруючых органаў, прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў членаў фонду.

13. **Праўленне ФСАСіМС:**

— у перыяд паміж агульнымі сходамі членаў фонду здзяйсняе кіраўніцтва і разглядае важнейшыя пытанні дзейнасці фонду;

— выбірае адкрытым галасаваннем старшыню фонду і яго намесніка, пры неабходнасці прымае рашэнне аб зменах у сваім складзе ў перыяд паміж агульнымі сходамі членаў фонду;

— вырашае іншыя пытанні, звязаныя з дзейнасцю фонду.

14. Праўленне ФСАСіМС праводзіць пасяджэнні па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў тры месяцы. Пастановы прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў прысутных членаў праўлення.

15. **Старшыня праўлення ФСАСіМС, яго намеснік:**

— арганізуюць выкананне рашэнняў агульнага сходу, работу праўлення;

— выдаюць рабочыя дакументы ФСАСіМС;

— размяркоўваюць грашовыя і матэрыяльныя сродкі фонду, устанаўліваюць парадак іх выкарыстання па ўзгадненню з праўленнем фонду, забяспечваючы шырокую галоснасць;

— прадстаўляюць фонд ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі, грамадскімі, кааператыўнымі і іншымі арганізацыямі як на тэрыторыі рэспублікі, так і за мяжой.

16. Для вядзення цякучай арганізацыйна-выканаўчай і ўліковa-бухгалтарскай работы праўленне стварае апарат фонду, зацвярджае яго структуру і штаты.

17. **Рэвізійная камісія ФСАСіМС:**

— выбірае са свайго саставу старшыню і сакратара;

— рэвізуе і кантралюе фінансава-гаспадарчую дзейнасць праўлення фонду.

Пасяджэнне рэвізійнай камісіі праводзіцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў паўгода.

**ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА ФСАСіМС**

18. ФСАСіМС з 'яўляецца юрыдычнай асобай, мае свой разліковы рахунак, пячаць, штамп і эмблему фонду. Узор пячаці, штампу, а таксама эмблема фонду ўстанаўліваюцца праўленнем фонду.

19. **Для забеспячэння сваёй дзейнасці ФСАСіМС:**

— можа мець свой орган друку;

— можа мець ва ўласнасці або арэндаваць будынак, абсталяванне і іншую маёмасць;

— можа ва ўстаноўленым парадку рабіць рэарганізацыю, ліквідацыю сваіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

20. ФСАСіМС можа быць ліквідаваны па сумеснаму рашэнню агульнага сходу членаў фонду і яго заснавальнікаў.

21. **Праўленне СФАСіМС знаходзіцца ў горадзе Гродна (ГрДзУ ім. Я. Купалы, Ажэшка, 22). Індэкс 230023.**

## *У ГОНАР СЛАВУТЫХ ЗЕМЛЯКОЎ*

**19 снежня 1990 года споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння Казіміра Альхімовіча, слаўнага сына зямлі Беларускай, сусветнавядомага мастака, змагара за гуманістычныя ідэалы, паплечніка Кастуся Каліноўскага.**

**Казімір Дамінікавіч Альхімовіч нарадзіўся ў маёнтку Дзембрава, што на Шчучыншчыне. Скончыў гімназію ў Вільні. За ўдзел у паўстанні К. Каліноўскага быў сасланы ў Сібір, дзе знаходзіўся да 1869 года. Вярнуўшыся на радзіму, К. Альхімовіч вучыцца ў прыватных майстэрнях, у Мюнхенскай акадэміі мастацтваў, затым жыве ў Францыі, а з 1878 года да канца свайго жыцця — у Варшаве, дзе памірае ў 1916 годзе.**

**Таленавіты мастак зрабіў шмат у розных відах мастацкай тэхнікі — графіцы, манументальным жывапісе, роспісе на фаянсе і фарфоры, мадэляванні, разьбе па дрэве, у станковым жывапісе. Яго творы выстаўляліся ў сусветнавядомых салонах Парыжа і Мюнхена, Сан-Францыска, Берліна, Варшавы, Пецярбурга і іншых асяродках мастацкай культуры свету.**

**З нагоды слаўнага юбілею 20 снежня 1990 года ў мастацкай школе № 2 г. Гродна адбылася ўрачыстая вечарына. У ёй прынялі ўдзел члены кафедры беларускай культуры нашага універсітэта. Выступілі са словамі пра Казіміра Альхімовіча старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі кандыдат гістарычных навук С. Я. Сільверстава і загадчык кафедры беларускай культуры прафесар П. У. Сцяцко.**

**21 снежня 1990 года адбылося выязное пасяджэнне Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі, абласнога савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і абласнога аддзялення Саюза мастакоў Беларусі на радзіму мастака К. Альхімовіча ў вёску Дзембрава Шчучынскага раёна. Тут, у мясцовай школе, адбыліся ўрачыстасці з нагоды 150-годдзя мастака. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел і выступілі са словамі пра Казіміра Альхімовіча загадчык кафедры беларускай культуры прафесар П. У. Сцяцко і старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі С. Я. Сільверстава.**

**24 снежня 1990 года ў памяшканні Гарадзенскага тэатра Тэйзенгаўза (тэатра лялек) адбылася ўрачыстая вечарына, прысвечаная 225-годдзю з дня нараджэння выдатнага палітычнага дзеяча, удзельніка паўстання пад кіраўніцтвам Касцюшкі, дыпламата, мемуарыста і кампазітара, аўтара сусветна вядомага паланэза «Развітанне з радзімай» (Паланэз Агінскага), нашага земляка Міхаіла Агінскага. Арганізатарам урачыстасцяў былі Гродзенскае аддзяленне Беларускага фонду культуры, абласная краязнаўчая асацыяцыя і Гродзенскае музычнае вучылішча. На вечары выступілі вучоныя і музыказнаўцы з Мінска і Гродна. Ад кафедры беларускай культуры бралі ўдзел дацэнт А. М. Пяткевіч, які выступіў са словам пра слаўнага нашага земляка, і загадчык кафедры прафесар П. У. Сцяцко.**

**На вечары прагучаў славуты Паланэз Агінскага.**

**П. СЦЯЦКО.**

# Зварот да студэнцкай моладзі

**Паважаныя сябры, калегі!**

**Нарэшце здзейснілася тое, аб чым марыла не адно пакаленне студэнтаў. Са студзеня 1991 года ў студэнцтва будзе свая газета.**

**«СТУПЕНИ»**

**«СТУПЕНИ»** — гэта штотыднёвік студэнтаў, моладзі і ўсіх, хто хоча лічыць сябе маладым.

**«СТУПЕНИ»** — гэта студэнцкі пункт гледжання на жыццё краіны, планеты, і, вядома, розных навучальных устаноў.

**«СТУПЕНИ»** — гэта погляд на студэнцтва з усіх палітычных і мастацкіх высот.

**«СТУПЕНИ»** — гэта 16 паласаў аператыўнай інфармацыі, «забойных» рэпартажаў і сур 'ёзных артыкулаў.

**«СТУПЕНИ»** — гэта сацыяльная і прававая ахова студэнтаў ва ўмовах пераходу да рынку.

**«СТУПЕНИ»** — газета інтэлігентных людзей, памочнік будучых парламентарыяў, міністраў, урачоў, педагогаў, бізнесменаў, якія дабіваюцца вялікіх поспехаў.

Нарэшце, **«СТУПЕНИ»** — гэта мільённы тыраж самай таннай агульнасаюзнай штотыднёвай газеты.

Адным словам, **«СТУПЕНИ»** — ваша газета!

Пішыце — **103982, Масква, Вялікі камсамольскі завулак, 8. Званіце — 206-87-24.**

**Рэдакцыя газеты «СТУПЕНИ».**

**ІНФАРМАЦЫЯ**

## *Шэсце «афганцаў»*

27 снежня ў 10 гадзін раніцы ў Мінску па ініцыятыве гарадской Асацыяцыі ветэранаў вайны і Афганістана «Памяць» і Савета сем 'яў загінуўшых воінаў, з дазволу выканкома Цэнтральнага райсавета народных дэпутатаў, сабраліся 90 чалавек былых воінаў-інтэрнацыяналістаў, родных і блізкіх загінуўшых для ўдзелу ў шэсці-рэквіеме, прысвечаным 11-й гадавіне ўводу войск Савецкай Арміі ў Афганістан.

На працягу гадзіны яны прайшлі па вуліцах горада, не ствараючы перашкод для руху транспарту. Затым сабраліся на востраве ракі Свіслач у раёне Старавіленскай вуліцы да месца, дзе мяркуецца ўзвесці помнік воінам-інтэрнацыяналістам.

Там яны правялі кароткачасовы мітынг і грамадзянскую паніхіду з удзелам свяшчэннаслужыцеля. На мітынгу быў прыняты зварот да Прэзідэнта СССР аб паляпшэнні пенсійнага забеспячэння інвалідаў афганскай вайны, прапанавана змяніць назву «воін-інтэрнацыяналіст» на «удзельнік вайны ў Афганістане», выстаўлена патрабаванне атрымаць ад Прэзідэнта адказ аб прычыне запозненага прыняцця рашэння аб вывадзе войск з Афганістана.

**«Звязда»**

## *Адзначылі каляды*

У Віцебскім мединстытуце ўпершыню ў яго гісторыі праведзены канцэрт, прысвечаны калядам, якія арганізавалі замежныя студэнты. Былі вершы, песні аб нараджэнні, жыцці, пакутах і смерці Ісуса Хрыста. На вечары былі таксама госці з Брэста і Іванава. У канцы паказалі мастацкі фільм аб Хрысце. І раздалі прысутным біблії. Бясплатна.

**«Звязда»**

* * *

Патрэбнасць краіны ў высока адукаваных работніках, стварэнне больш гібкай сістэмы прафесіянальнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў выклікалі неабходнасць стварэння Усесаюзнай асацыяцыі адукацыі дарослых. Яе заснавальнікам стала таварыства «Веды», аб 'ядноўваючае два з чвэрцю мільёны членаў.

У лік асноўных мэт і задач новай асацыяцыі ўваходзіць вывучэнне і распаўсюджванне заходняга вопыту арганізацыі самаадукацыі дарослага насельніцтва, што асабліва важна ва ўмовах эканамічнай кан 'юнктуры пры пераходзе да рынкавых адносін.

**«Учительская газета»**

* * *

Гродзенскаму дзяржаўнаму гісторыка-археалагічнаму музею, аднаму са старэйшых у рэспубліцы, у гэтым годзе спаўняецца 70 гадоў. Калекцыя сабраных прадметаў даўніны налічвае больш ста тысяч прадметаў. Таму выстаўкі ў музеі рэгулярна мяняюцца.

Да ўрачыстасцяў, прысвечаных юбілею музея, у адной з яго залаў адкрыта выстаўка «Кладовая народного наследия». Тут прадстаўлены першыя экспанаты, якія трапілі да нас як падарункі ад гараджан. Гэта старажытная зброя, рэдкія кнігі, прадметы этнаграфіі. Экспанаты розныя, яны даюць магчымасць гараджанам і гасцям Гродна пазнаёміцца з прадметамі, раней захаванымі ў сховішчах.

Дзейнічае ў музеі і выстаўка «Скарбы».

ДЗІЦЯЧАЕ СВЯТА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

# КАРЛСАН ПРЫЛЯЦЕЎ!

Карлсан, «лучший в мире выдумщик», «красивый, умный и в меру упитанный мужчина в самом расцвете сил» (на гэты раз вельмі добры і вельмі шчодры), падарыў радасць нашым дзецям.

Усё пачалося з аб 'явы. За месяц да ранішніка старшыня нашага прафкома У. А. Хілюта павесіў яркую, вясёлую аб 'яву аб будучым свяце. Дзеці, атрымаўшы запрашэнне Карлсана, разам з бацькамі рыхтаваліся да незвычайнай сустрэчы з любімым героем: рабілі малюнкі на тэму: «Наша сям 'я», вучылі вершы, перачытвалі творы Астрыд Ліндгрэн. Нарэшце гэта сустрэча адбылася. Прыбраныя, прыгожыя бацькі, бабулі і дзядулі на некалькі гадзін забыліся пра работу, пра хатнія справы. Шчаслівыя хлопчыкі і дзяўчынкі з радасцю прымалі падарункі Карлсана, актыўна ўдзельнічалі ў віктарыне, конкурсах. Мы ўбачылі і пачулі сваіх дзяцей у час конкурсу чытачоў «Мы любім жывёл», ацанілі іх малюнкі. Карлсан падрыхтаваў дзецям сюрпрыз: кожны запрашальны білет (ён быў з нумарам) аказаўся латарэйным. І ўсе латарэйныя білеты былі шчаслівыя: нехта атрымаў машыну, нехта посуд, а некаму нават вельмі пашанцавала, як і Малышу з аповесці Астрыд Ліндгрэн. Памятаеце! «Малыш был так счастлив, что у него заныло где-то внутри, то ли в душе, то ли в животе. А может быть, так всегда бывает, когды ты счастлив!» Вярнуліся дадому са шчанём, самым звычайным, жывым, прыгожым, Богуш Дзіма, Даша і Каця Пчэльнік, Міша і Лёва Вышнікавы.

А яшчэ быў арганізаваны гандаль цацкамі і сувенірамі, зробленымі студэнтамі педвучылішча, глядзелі дзеці фільм «Як праводзяць канікулы Болек і Лёлек», былі і фотаздымак на памяць, і «Ламбада» ў холе, і пачастунак мам і бабуль, парады фрэкен Бок «Як рыхтаваць абед у сучасных умовах», музычная паўза, спартыўная размінка.

Каля пяці гадзін цягнулася гэта свята. Падарункі атрымалі не толькі дзеці, але і мамы, якія праявілі сваё кулінарнае майстэрства.

УРАЖАННІ

## Што думаюць дзеці?

**НАВУМОВІЧ Максім** (4 гады):

— Больш за ўсё мне спадабаўся Карлсан, таму што ён частаваў, дарыў падарункі. Я атрымаў машынку «Спутник». Калі б Карлсан прыляцеў да мяне дахаты, я б гуляў з ім, частаваў варэннем...

**Жанна МУРЗІЧ** (6 гадоў):

— Карлсан вельмі добры, лепшы, чым у кнізе і «мульціку». Ён трошкі хуліганіў, страляў, рабіў «плюх», шмат еў і ўсіх нас частаваў. Спадабаўся ранішнік. Рулле і Філле былі таксама добрыя. А маёй сястрычцы Ілоне спадабалася Восень, якая частавала яблыкамі і была ў прыгожай жоўтай сукенцы. І мультфільм пра Болека і Лёлека спадабаўся.

**Грыша КІРЫЛЮК** (7 гадоў):

— Мне спадабалася, што Карлсан хуліганіў, што былі падарункі і пачастунак. Фільм таксама быў вельмі добры. Болек і Лёлек думаюць са злосцю, а робяць ўсё весела. Спадабаліся ўсе героі: Карлсан, Рулле, Філле, фрэкен Бок...



## Лепшы ў свеце Карлсан

«...Земля такая огромная, и на ней столько домов! Большие и маленькие. Красивые и уродливые. Новостройки и развалюшки. И есть еще совсем крошечный домик Карлсона, который живет на крыше. Карлсон уверен, что это лучший в мире домик и что живет в нем лучший в мире Карлсон. Малыш тоже в этом уверен.

Что до Малыша, то он живет с мамой и папой, Боссе и Бетан в самом обыкновенном доме, на самой обыкновенной улице в Стокгольме, но на крыше этого обыкновенного дома, как раз за трубой, прячется домик с табличкой над дверью: Карлсон, который живет на крыше, лучший в мире Карлсон.

Наверняка найдутся люди, которым покажется странным, что кто-то живет на крыше, но Малыш говорит:

— Ничего тут странного нет. Каждый живет там, где хочет».

Астрид Линдгрен. Три повести о Малыше и Карлсоне.

УРАЖАННІ

## Бацькі пра свята сказалі так:

**БЕЛЫХ С. М.:**

— Свята атрымалася. І бацькі, і дзеці вынеслі шмат уражанняў, а апошнія яшчэ і столькі ж падарункаў. Арганізатары свята папрацавалі на славу і за гэта ім вялікае дзякуй. Праграма была цікавай і насычанай. Дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел ва ўсіх гульнях і конкурсах. Хочацца верыць, што нашы дзеці яшчэ не раз атрымаюць магчымасць сустрэцца з любімымі героямі казак, а таксама з людзьмі, якія ператвараюць такія сустрэчы ў свята.

**САВАШЫНСКАЯ Л. А.:**

— Да свята мы рыхтаваліся ўсёй сям 'ёй. Малюнак у сына не атрымліваўся. Тата пазіраваў на дыване з вудай... У ВНУ я з 1979 года. Такое свята ў сценах нашага універсітэта было ўпершыню. Мяне ўразіў размах, адчувалася, што праведзена вялікая работа. Карлсан шчодра частаваў, нашы дзеці елі мандарыны, яблыкі, шакалад, цукеркі. Атрымалі шмат падарункаў. Спадабалася распрадажа цацак. зробленых студэнтамі педвучылішча. Хочацца падзякаваць арганізатарам гэтага мерапрыемства.



**Карлсан прыляцеў дзякуючы і У. А. Хілюце, аднаму з актыўных арганізатараў свята.**

**МЕЛЬНІКАЎ М. А.:**

— У нашым жыцці бываюць святы, але такіх яркіх, змястоўных, цікавых, з сюрпрызамі яшчэ не было. Унучка мая Наташа атрымала сапраўднае задавальненне і адразу ж пасля свята спытала: «А калі зноў такое будзе?».

**ЧЫГРАЙ Р. А.:**

— Маім дзяўчынкам, Каці і Машы, гэта мерапрыемства вельмі спадабалася. Рэдкая для іх забава ва ўсіх адносінах. Праўда, ўсё нагадвала дабрачынны вечар — увесь час нешта раздавалі, дарылі... Мы вельмі ўдзячны прафкому за гэта свята.



**А дзяўчынка з гэтага здымка, Насця Дарошына, была самай вясёлай і актыўнай удзельніцай свята.**

**МУРЗІЧ Л. У.:**

— Вядома, Швецыя, адкуль прыляцеў да нас Карлсан, багатая краіна. Але не толькі па гэтай прычыне Карлсан быў такім шчодрым. Дапамог яму ў гэтым **прафком**, і рэктар **Аляксандр Васільевіч Бадакоў**, якія далі грошы на правядзенне мерапрыемства. Дзякуй студэнтам-філолагам: **Наталлі Грынкевіч, Закрэўскаму Віталію, Дарашкевіч Дане**, Аўтуху Андрэю, Януцэвіч **Ірыне, Чарняўскай Наталлі, Святлане Янчанка**. А за цудоўнае афармленне залы мы вельмі ўдзячны студэнтцы факультэта пачатковага навучання **Ірыне Немаляевай**. Дзякуй выкладчыкам музыкі **С. М. Вышнікавай і М. А. Аўхімені**, выкладчыкам-філолагам **Рычковай Л. В., Сіманавай Т. Г., Жуку І. В.**, фатографу **У. Сарокіну**, работніку ФГП **У. Ляўшуку**. Дзякуй **Л. І. Бабр\оўнік і Т. А. Бадзюковай**, якія так стараліся пачаставаць нашых дзяцей фруктамі і ласункамі. Вялікае дзякуй усім, хто дапамог пры падрыхтоўцы і правядзенні гэтага свята.

І апошняе: у прафкоме можна атрымаць фотаздымак на памяць аб гэтым ранішніку.



**Я с бабушкой своею**
**Дружу давным давно,**
**Она во всех затеях**
**Со мною заодно.**

**Так думае і гаворыць унучак Л. У. Кірылюк Грыша, які вельмі пасябраваў з Карлсанам.**



**І зноў фотаздымак на памяць...**



**ЖЫВАЯ СПАДЧЫНА НАРОДА**

# У ім агонь рэвалюцыі жыў

*пра асобу Алеся Гаруна*

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух — адна з найбольш балючых старонак нашай гісторыі. І замест таго, каб асэнсаваць, разабрацца ў тым, што было, яго па розных прычынах на працягу доўгіх гадоў проста абыходзілі маўчаннем, наклаўшы табу на многія факты і імёны. У лік такіх і трапіла імя слаўнага сына беларускага народа Алеся Гаруна.

Асоба А. Гаруна — рэвалюцыянера, пакутніка, выдатнага паэта і празаіка — ахутана легендай. 33 гады пражыў ён на свеце. З іх дзесяць гадоў адабралі ў яго турма, катарга і пасяленне ў Сібіры.

Алесь Гарун (**Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі**) нарадзіўся 11 сакавіка 1887 года ў сям'і рамесніка ў Мінску, але шмат часу праводзіў у вёсцы каля Баранавіч, адкуль паходзілі яго бацькі. Адукацыя ў Гаруна была небагатая. Закончыў ён толькі рамесніцкае вучылішча (1902 г.), пасля якога працаваў у сталярных майстэрнях і на мэблевай фабрыцы ў Мінску. У 1904 годзе ўступіў ён у партыю і актыўна ўключыўся ў падпольную рэвалюцыйную дзейнасць. А. Гарун вёў прапаганду сярод Мінскай вучнёўскай моладзі і работнікаў. Найлепш яму ўдавалася арганізаваць моладзь у вучнёўскія рэвалюцыйныя гурткі. У ноч на чацвёртае сакавіка 1907 года маладога рэвалюцыянера арыштавалі ў падпольнай друкарні на вуліцы Шырокай у Мінску. Друкавалася там адозва пад назвай «Ко всем трудящимся», у якой рабочыя заклікалі да барацьбы супраць існуючага ладу, за ідэалы сацыялізму.

Пасля віленскай Лукішскай турмы Гарун трапіў у Сібір на катаргу, якая з цягам часу была заменена пасяленнем. Там ён пісаў вершы, пасылаў у «Нашу ніву».

У 1914 годзе падрыхтаваў паэтычны зборнік **«Матчын дар»,** які выйшаў у свет толькі ў 1918 годзе.

Пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі, якая паклала пачатак новаму і ў той жа час апошняму этапу ў жыцці Гаруна, ён выбіраецца дэпутатам Савета Ленінскай залатапрамысловай акругі. Потым — Масква. А ў верасні 17-га вяртаецца ў Мінск. У складаных умовах нямецкай акупацыі ён актыўна ўключаецца ў пісьменніцкую і грамадскую дзейнасць. Зразумець усё, што тады адбывалася вакол, асабліва катаржніку, чалавеку, які каля дзесяці гадоў быў адарваны ад Радзімы, было нялёгка. Быў ён звязаны з тагачаснымі нацыяналістычнымі арганізацыямі, погляды яго мяняліся. Гарун пакінуў партыю эсэраў, членам якой быў з семнаццаці гадоў, уліўся ў Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю, напісаў яе праграму, якая ў некаторых момантах супадала з праграмай бальшавікоў.

Свае ідэйна-палітычныя погляды Гарун найбольш выразна сфармуляваў у артыкуле «Одгукі», апублікаваным 7 студзеня 1918 года. Тут выявілася ўся супярэчнасць ідэйных пазіцый паэта. Ён добра не ведаў, чым Сацыялістычная Савецкая Расія адрозніваецца ад Расіі царскай, але тую, ранейшую Расію, у якой было ўзаконена палітычнае і культурнае бяспраўе нацыянальных ускраін, ён не мог прыняць.

Не ведаючы палітыкі маладой Савецкай Рэспублікі па двух кардынальных пытаннях: па нацыянальным і зямельным, ён тады ўжо выступіў супраць тых, хто ў друку ўсімі сіламі спрабаваў даказаць неабходнасць аб'яднання беларускіх зямель з будучай Польшчай. Але як магло здарыцца, што весенню, 19-га года, калі легіёны пад камандаваннем Пілсудскага ўсё ж нахлынулі на беларускую зямлю, А. Прушынскі, будучы старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэта, у верасні вітаў у Мінску кіраўніка новай Польшчы ад імя беларускай грамадскасці. Неўзабаве загадам Пілсудскага ён быў прызначаны членам так званай Беларускай вайсковай камісіі (БВК), якая павінна была арганізаваць беларускую антысавецкую армію.

Перад намі — адна з заблытаных старонак гісторыі. Аднак святло на гэта пытанне пралiваюць архіўныя матэрыялы. У дакументе, які падрыхтавала разведка польскага генштаба, зафіксавана, што восенню 1919 года ў Смаленску паміж прадстаўнікамі беларускіх эсэраў і бальшавікамі было заключана пагадненне аб сумеснай барацьбе супраць белапольскіх акупантаў. Беларускія дзеячы павінны былі ўзяць пад свой кантроль БВК, увесці ў праўленне камісіі сваіх людзей і, выкарыстоўваючы свой уплыў, не падпусціць да беларускага войска афіцэраў, якія варожа ставіліся да бальшавікоў. У дакуменце аддзела разведкі польскага генштаба ясна сказана, з якой мэтай А. Прушынскі пайшоў у БВК, аб гэтым можна меркаваць і па выніках дзейнасці камісіі, якая аказалася паралізаванай унутры.

У час, калі антыбальшавіцкая агітацыя дасягнула небывалых размераў, у А. Гаруна мы не знойдзем ніводнага антысавецкага артыкула, хоць у друку выступаў ён даволі часта.

У перыяд грамадзянскай вайны і акупацыі Алесь Гарун не меў магчымасці адкрыта выказваць свае думкі. Хвароба тым часам рабіла сваю справу (на катарзе ён захварэў на невылечную тады хваробу — сухоты), і 20 ліпеня 1920 года яго не стала. І тое, што пахаваны ён не на радзіме, а ў Кракаве, не віна яго, а бяда, бо Гаруна амаль непрытомнага забралі ў санітарным вагоне адступаючыя часці польскіх войск.

Акрамя «Матчынага дару» да нас дайшоў зборнік п'ес **«Жывыя казкі»,** куды ўвайшло каля 40 паэтычных твораў, апавяданні, публіцыстычныя артыкулы. Па сваіх матывах і тэматыцы паэзія Гаруна блізкая да паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа. У яго такое ж неадольнае жаданне лепшай долі для народа, такая ж непрымірымасць да несправядлівасці, гатоўнасць ахвяраваць сабой для шчасця бацькоўскай зямлі, для людзей. І толькі больш абвостраны сум па радзіме, па волі, якой ён быў пазбаўлены столькі гадоў. Чытаючы Гаруна, мы захапляемся яго дальнабачнасцю, непахіснай верай у перамогу праўды і святла, і ўсведамленне таго, якім цяжкім і пакутлівым будзе шлях да гэтай праўды, да ўсеагульнай справядлівасці:

**...І покуль сонца ўзыйдзе,**
**Дык вочы выесць нам**
**салёная раса,**
**І покуль першы дзень**
**людскога шчасця прыйдзе,**
**Мільёны сэрц праткне**
**гароты злой каса.**

Літаратурная спадчына А. Гаруна нарэшце вернута народу. І, як некалі, гучаць яго словы, яго запавет:

**Ты, мой брат, каго зваць**
**Беларусам,**
**Роднай мовы сваёй**
**не цурайся;**
**Як не зрокся яе**
**пад прымусам,**
**Так і вольны цяпер**
**не зракайся.**

**С. ГУБЕРНАТАРАЎ,**
**студэнт юрыдычнага факультэта.**

**У ПРАГРАМЕ СПАРТАКІЯДЫ**

## *МАЦНЕЙШЫЯ ШАХМАТЫСТЫ ВЫЗНАЧАНЫ*

У канцы мінулага года адбылося першынство універсітэта па шахматах у праграме спартакіяды.

Паказчыкі каманднай барацьбы наступныя:

**1 месца** — шахматысты матэматычнага факультэта, 2 — фізічнага, 3 — біяфаку, 4 — гістарычнага, 5 — юрыдычнага, 6 — філалагічнага факультэтаў.

Пераможцаў асабістага першынства па дошках вы бачыце на верхнім здымку справа: **Алену Ляпешка** (І курс матфака), **Дзмітрыя Рудакова** (І курс матфака), **Аляксандра Няілку** (4 курс фізфака), **Ігара Бекіша** (1 курс матфака).

**На левым здымку** — **Ала П'яніна,** мацнейшая шахматыстка універсітэта. Яна вучыцца на другім курсе біялагічнага факультэта.

На правым здымку ўнізе — госць турніра **Канстанцін Купрыянавіч Іскра,** выкладчык універсітэта.








| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, **тэл. 44-72-97** | Газета выходзіць штотыднёва | Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4. | Зак. 142<br>2000 экз. | Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ. |